CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

MOB 2015

WPISUJE ZDAJĄCY

KOD

PESEL

*miejsce na naklejkę*

dysleksja

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

## PRZYKŁADOWY ARKUSZ EGZAMINACYJNY

DLA OSÓB SŁABOSŁYSZĄCYCH (A3)

DATA: **19 grudnia 2014 r.**

CZAS PRACY: **do 200 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 13 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

Układ graficzny
© CKE 2015

MOB 2015

**Заданне 1.**

Ганна Кісьліцына

***Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай прозе***

Нягледзячы на тое, што беларускія пісьменнікі па-ранейшаму не пакідаюць спробы стварыць буйны, панарамны вобраз грамадства і чалавека ў ім, цяжка не заўважыць, што за апошнія дваццаць гадоў у айчыннай літаратуры немагчыма назваць хоць бы адзін рэалістычны буйнамаштабны раман, не кажучы ўжо пра трылогіі і пенталогіі. Страчваецца не толькі давер да вялікіх формаў – метанаратываў, але і да саміх наратараў – пісьменнікаў у ролі вяшчальнікаў ісціны ці праўдзівых сведак.

Сучасны пісьменнік не задаволены месцам «эстэтычнага ізгоя[1]», чыя творчасць зарыентавана на вузкае кола інтэлектуалаў-аднадумцаў. З другога боку, ён не мае магчымасці, застаючыся ў межах «высокай літаратуры», авалодаць увагай публікі.

Пошук новых камунікатыўных сродкаў выкліканы не толькі праблемамі, якія склаліся паміж нацыянальным пісьменствам і ўласна беларускім чытачом, праблемамі, якія дзесяцігоддзямі не знаходзяць свайго вырашэння. Сённяшнія прыярытэты чытацкай масы фарміруюцца не літаратурнай крытыкай, а журналістамі і рэкламістамі папулярных газет і часопісаў, што, відавочна, ускладняе і без таго напружаныя адносіны між чытачом і аўтарам, які, як правіла, у сённяшняй сітуацыі адчувае выяўны недахоп увагі, як з боку чытачоў, так і крытыкі.

Спецыфічнасць такога становішча аўтара паражае яго мастацкую агрэсіўнасць, якая выяўляецца ў тым, што апошні ўсімі сродкамі спрабуе ўцягнуць чытача ў актыўную спрэчку, у дыялог з сабой, справакаваць на выяўную рэакцыю. У замежным літаратуразнаўстве гэтая стратэгія атрымала назву «маска аўтара». Няўпэўненасць аўтара ў тым, што ён здатны пры дапамозе развагаў альбо дзеянняў персанажаў, сімволікай ці апеляцыяй да агульначалавечай маралі ўзбудзіць чытацкую ўвагу і ўцягнуць яго ў актыўныя стасункі, прыводзіць да таго, што ён бярэ слова ад свайго імя, каб уступіць з чытачом у дыялог і асабіста, тэт-а-тэт, растлумачыць сутнасць задумы.

Ганна Кісьліцына, *Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай прозе*, [у:] І. Багдановіч (рэд.), *Новае слова ў беларусістыцы. Літаратуразнаўства і фалькларыстыка*, Мінск 2012, с. 31.

**Заданне 1.1. (0–1)**

На аснове цэлага тэксту адкажы на якія тры праблемы сучаснай беларускай літаратуры звяртае ўвагу Ганна Кісльліцына?

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

[1] Ізгой – *перан.* Чалавек, ад якога ўсе адхіліліся, які страціў сваё становішча ў грамадстве, адшчапенец.

**Заданне 1.2. (0–2)**

У чым заключаецца мастацкая агрэсіўнасць, пра якую аўтарка піша ў апошнім абзацы? Апішы яе прычыны.

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

**Заданне 1.3. (0–2)**

Растлумач значэнне слоў: *межы «высокай літаратуры»*, пра якія аўтарка піша ў другім абзацы. Абгрунтуй выкарыстанне двукосся ў гэтым выказванні.

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

**Заданне 1.4. (0–2)**

Які з запрапанаваных ніжэй тэзісаў прадстаўляе агульны сэнс тэксту? Выбяры адзін з пададзеных варыянтаў і абгрунтуй свой выбар, спасылаючыся на змест тэксту.

1. Сучасная літаратура развіваецца дынамічна і шматбакова.
2. Сёння можам назіраць заняпад літаратурнага жыцця.
3. Становішча сучаснай літаратуры больш складанае, чым раней.

*Выбіраю варыянт*.................

Абгрунтаванне:

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

**Заданне 2.**

***"...сваёй задачай лічу разбурэнне стэрэатыпаў...". Інтэрв'ю.***
***З Андрэем Хадановічам гутарыць Ганна Кісьліцына***

*Творчасць – гэта, так ці інакш, спроба самаідэнтыфікацыі асобы. Як бы ты сёння вызначыў сваё месца ў жыцці і, у прыватнасці, у беларускай культурнай прасторы?*

– Я назваў бы сябе ўцекачом і парушальнікам межаў. І не толькі як перакладчык, бо для гэтых людзей парушэнне мяжы звычайная, прафесійная рэч. Я маю на ўвазе выйсце літаратара па-за межы традыцыйнай у нас сферы існавання беларускага слова. Гэта выйсце з адвечнага кола наяўных у нашай паэзіі тэмаў, з сілавога поля прывычнага ўзнёслага пафасу, развітанне з гранічнай сур'ёзнасцю, уласцівай нашай “высокай”

паэзіі, спроба змяніць спрыкрэлыя ўжо інтанацыі паэтычнага аповеду з даміноўнымі нотамі смутку, меланхоліі, пакрыўджанасці, скаргаў, уцёкі ад штампаў, што даўно дыскрэдытавалі сябе, аднак дагэтуль прадукуюцца нашымі "культурнымі героямі" ў неймавернай колькасці. Гэта ўжо літаратура, якая навучылася крытычна глядзець на сябе самую, якой уласцівая іронія, і – больш за тое – самаіронія. [...]

*– Ці мусіць сучасная літаратура – пры ўсёй яе тыпалагічнай герметычнасці – усё-такі рэагаваць на жыццё з усімі яго праявамі?*

– А якое "жыццё" ты маеш на ўвазе? Рэальнасць у кожную эпоху асэнсоўвалася па-рознаму: то як прырода, то як чалавечае грамадства, то як суб'ектыўная рэальнасць – унутраны свет чалавека, сфера псіхікі. Адпаведна і мастацтва – кожнага разу мяняла сферу рэчаіснасці, на якую рэагавала. Да таго ж, было зробленае істотнае адкрыццё: мы ўспрымаем рэальнасць не наўпрост, а праз прызму створанай чалавекам культуры. Паміж мастаком і натурай – процьма карцінаў, пісаных з гэтай натуры да яго. Паміж паэтам і жыццём, на якое ён нібыта рэагуе, – неймаверная колькасць тэкстаў, створаных раней. Творца апынаецца ў дастаткова замкнёнай сферы зробленага да сябе, праз якую ўспрымае не толькі гісторыю, але і сучаснасць. А пасля з'яўляюцца розныя віртуальныя рэальнасці і канчаткова ўсё заблытваюць.

http://dziejaslou.by/old/www.dziejaslou.by

**Заданне 2.1. (0–1)**

Якія змены ў сучаснай літаратуры назірае Андрэй Хадановіч? Назаві іх і ахарактарызуй уласнымі словамі.

1. ...........................................................................................................................

...........................................................................................................................

2. ...........................................................................................................................

...........................................................................................................................

**Заданне 2.2. (0–2)**

Андрэй Хадановіч успамінае пра "культурных герояў". Чаму выкарыстоўвае такое словазлучэнне і да каго яно адносіцца?

...........................................................................................................................

...........................................................................................................................

...........................................................................................................................

**Заданне 2.3. (0–2)**

Растлумач значэнне метафар

1. парушаць межы – ..........................................................................................

2. адвчнае кола – ..........................................................................................

**Заданне 2.4. (0–1)**

Падай сінонімы да запрапанаваных тэрмінаў:

істотны – ..........................................................................................................................

рэальны – ..........................................................................................................................

**Заданне 3.**

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. Вернасць сваім ідэалам ці іх адмаўленне дзеля ратавання каханага чалавека? Абмяркуй праблему і абгрунтуй свой погляд на аснове ніжэй пададзенага фрагмента тэксту Максіма Гарэцкага *Стары прафесар* і іншага тэксту культуры. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

Максім Гарэцкі

***Стары прафесар***

(скарочана)

Дзеялася тое дужа даўно...

Прыязджаў некаліcь да пані ў госці стары прафесар з маладою жонкаю, панінай пляменніцай[2].

Прыехалі яны аднаго разу з Пецярбурга на папраўку познаю вясною […].

Надта ж любіў гэты пажылы вучоны чалавек сваю невялічкую рухавенькую жонку. […]

Палюбіў народ і яго жонку. […]

Дык не дзіва, што надта ўсім было жалосна, калі захварэла маладзенькая паня на якуюсь цяжкую і цягучую хваробу.

Як прыйшло жніво […] бесперач стаяла ля сіняга плота карэта па доктара. То завазіла, то прывазіла, а палёгкі ніякае няма. […]

Схудзеў прафесар, аблахмаціўся, вочы ў яго ўваліліся, гаруе бедны, як не плача пры людзях. Лячыў, лячыў дактарамі і прыждаў таго, што ўсе дактары ў адзін голас зусім яго абезнадзеілі. Хоць нічога яму страшнага не казалі, але відаць па іх, што чакаюць канца і як бы дзівяцца, чаму хворая так доўга не даецца смерці.

Хадзілі да яго і нашы бабы-шаптухі са сваімі радамі, ды ён і слухаць іх не хацеў, нават з старою паняю за іх пасварыўся. Няўцям гэта было людзям: казкі ж простыя слухаць любіў, чаму ж, думалі, не хоча спрабаваць простыя рады? Бывае ж, – памагае.

Тым часам адбіў ён тэлеграму ў Пецярбург найлепшаму доктару. Прыехаў. […] Пастукаў, паслухаў, паківаў галавою, як пераказвала пакаёўка, ды і развёў рукамі таксама, як і тутэйшыя дактары: няма надзеі. […]

Хворая ссохла, збялела, знядужала ў канец: адны косці, абцягнутыя тоненькаю скураю. […] Прафесар […] абхопіць хворую, сашчэпіць у сваіх абоймах, прытуліць да яе пасохшых грудзей сваю сівую галаву і шэпча, як здурнеўшы: «Не, не, не! Гэтага быць не можа! Ты не памрэш! Ты не памрэш! Я хачу, каб ты жыла. Мы ізноў будзем гуляць вечарамі ў садзе... Мы ізноў будзем гаманіць... А то не, мы кінем гэтае гіблае месца! Мы паедзем у Пецярбург! Паедзем, паедзем... Чуеш, рыбка мая, я не хачу, каб ты памерла, ты не памрэш, не! не!! не!!!» […]

[2]Пляменніца – дачка брата або сястры.

Пакаёўка Аўгення была сірата і мела толькі аднаго дзядзьку. […] Яна часам бегала да дзядзькі пагаманіць і, вядома, пераказвала, што дзеецца ў панскім будынку. Жаль было Якіму добрага прафесара і яго маладой жонкі. І параіў ён, каб сказала панам зрабіць так: абвязаць хворую сырою ніткаю і кінуць тую нітку на раздарожжы, каб зняла хваробу. Аўгення, вядома, дзяўчына, не сказала старой пані з вока на вока, а бухнула ў сталовай за абедам, калі быў і прафесар. […]

– Зрабіце так, зрабіце, пан прафесар! – кажа старая. – Зрабіце, калі вам дарага мая Вольгачка.

А Вольгаю звалі хворую.

Прафесар за час хваробы жонкі зрабіўся апрысклівы, гняўлівы...

І тут загневаўся:

– Я чалавек навучны, а вы мне дурніну такую кажаце.

– Пабойцеся вы Бога, пане прафесар, з сваёю навукаю, – аж дрыжыць і слёзы абцірае старая пані. – Што вам даражэй: ваша навука ці... ці... жыццё... жыццё Вольгачкі?..

І вось прафесар паказаў сваё каменнае навучнае сэрца. Гаворыць так:

– Навука сказала свае слова, і я веру ёй, а не вашым забабонам. […]

Тую ноч была радоўка[3] пільнаваць хворую прафесару з Аўгенняю. […]

К гэтай ночы хворая зусім струхлела[4]. Гарачка адпусціла бедную, дык ляжала выцягнуўшыся, як доўгі шкілет, сіняя, непарушная.

Цеміць прафесар, што смерць у пакой увайшла. Цеміць і з галавы сходзіць. Сатне зубы, абхопіць галаву рукамі і сядзіць, пахінуўшыся да кален, у крэсле.

Калі хворая задрамала трошкі, выйшаў ён на мысічках у другі пакой і давай штосьці шаптаць.

Прыслухаецца Аўгення і чуе, што ён спамінае ўсё то жонку, то навуку. […]

– Спіць? – шэптам спытаўся прафесар у Аўгенні і, убачыўшы, як кіўнула галавою, выйшаў у сад – прахаладзіцца ці хто ж яго ведае чаго. […]

Слухае Аўгення і пачала патроху разбіраць, што там шэпча з гора чалавек.

– Вольгачка, Вольгачка, ты і навука – усё жыццё маё. Ты, – кажа, – ахарашыла для мяне навуку, а без цябе і навука ні ўва што.

Потым раздумаўся, памаўчаў дый кажа, быццам няўмысля лютуючы сябе.

– Не, – кажа, – навука вышэй за цябе, навука вышэй за ўсё, і без навукі мне было б нудна нават з табою, хоць ты адна і найлепшая для мяне ўва ўсім свеце. І ты памрэш, і я памру, а навука не павінна памерці і здрады не павінна цярпець.

«Божухна-Бацюхна! – памысліла дзяўчына. – Не любіць ён жонкі, усе мужчыны такія: то халяруе ад кахання, то гатоў за якуюсьці навуку на смерць жонку аддаць».

– Памрэш ты, Вольгачка, – шэпча ён далей, – і застанецца мне адна пацеха – навука мая. Дык ці ж магу абразіць яе забабонамі? Гэтая нітка – знявага для навукі і для майго імя. […]

– Тут, – кажа, – справа не ў нітцы і не ў забабонах, а ў здрадзе навуцы, якую любіў, калі яшчэ і Вольгачкі не любіў.

– Няўжо ж, – кажа, – магу я напляваць на сваю веру? […]

Ціха, але жудасна, аж скура стыгне, зарагатаў:

– Пляваць мне на цябе, навука, калі ты бяссільная! […]

Тым часам прыблізіўся на мысічках прафесар, прыхіліў да жончыных грудзей галаву, паслухаў. «Дыхае», – шэпча Аўгенні іківае да сябе пальцам, гукае Аўгенню за сабою. Як выйшлі, пытаецца: «Ці няма ў цябе, Аўгінка, пад рукою якой нітачкі? Буду паперы разбіраць у кабінеце, трэба звязаць у пачкі». Зразумела яна, на якую патрэбу просіць нітку і зараз збегала ў сваю каморку, прынесла.

---

[3]Радоўка – чарга.
[4]Струхлела – тут: выглядала на безнадзейна хворую.

– Ну, галубка, ідзі троху паспі, – сказаў ёй прафесар, – я пакуль што адзін пабуду, а як трэба, дык узбуджу. Пайшла Аўгення, а троху пачакаўшы, дасачыла з-за вушака: абвязвае наўчоны прафесар хворую жонку ніткаю. Абвязаў, асцярожненька прапусціўшы пад ногі і пацягнуўшы вышэй пад тулава, потым пацалаваў жонку ў лоб, пераксціў (чаго ніколі, ніколі раней не рабіў) і з ніткаю ў руцэ паціхеньку выйшаў у сад.

Аўгення сцяміла, што ён пабрыў за сіні плот на раздарожжа, і была дужа рада. […]

– А я трошкі прагуляўся, – вінавата, але спакойна і радасна казаў прафесар. […] Ну як ты сябе чуеш, рыбка мая?

– Як бы лепей... – усміхнулася яму хворая цянюсенькімі вуснамі і раскрыла вочы.

– Чамусь мне верыцца, рыбка мая, што ты з гэтае начы пачнеш папраўляцца... У цябе сягоння быў крызіс. Вось пабачыш, рыбка!

– Мне лепей... чую, што лепей! – парадавала мужа хворая і пацягнула худзенькую, васковую ручку, каб пацалаваў: – Цяпер ідзі спаць, мой любы.

Назаўтра Аўгення збегала да дзядзькі і сказала, што пан такі даўся з сваёю навукаю. Усе людзі з надзеяй чакалі паляпшэння хворай. Але не магла памагчы навука, – не памаглі і забабоны. На трэці дзень хворая сканала.

М. Гарэцкі, *Стары прафесар* [у:] Я. Грыгарук, *З васількoвых крыніц. Падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 2 класа сярэдніх школ,* Warszawa 2003, s. 216–221.

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

Максім Танк

***Прытча пра хлеб***

Аднойчы на кірмаш здалёк
Вандроўнік плёўся ў горад
І наракаў на свой мяшок,
Набіты лустай спорай.

Аж Хлеб не вытрымаў і так
Азваўся: - Што бядуеш?
Зусім не ты мяне, дзівак,
Але цябе нясу я.

- Ну, што ж, пабачым: хто - каго! -
Той запярэчыў строга
І з цяжкага мяшка свайго
Хлеб вытрас на дарогу.

І сам пашкандыбаў далей.
Нішто не муліць плечы.
Дзень прамінуў. Ужо ў імгле
Стаў набліжацца вечар.

Настаў і час перакусіць.
Успомніў Хлеб Вандроўнік,
Што недзе, кінуты, ляжыць,
Духмяны і цудоўны!

Прылёг на нейкім дзірване,
Каб адпачыць хоць трошкі.
Але галоднаму і ў сне,
Знаць, сняцца хлеба крошкі.

Цяпер і сам сабе не рад.
Не спіцца, не ляжыцца.
Ці не вярнуцца лепш назад
Ды з другам памірыцца.

Устаў Вандроўнік і брыдзе -
Ідзе пад зорным небам
На месца памятнае, дзе
Ён пасварыўся з Хлебам.

О, як ён рад быў зноў, калі
Сваю пабачыў страту!
І Хлебу нізкі, да зямлі,
Аддаў паклон, як брату.

http://knihi.com/

# WYPRACOWANIE

**na temat nr ………..**

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

.........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 – 3 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 6 – 9 – 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 1 – 2 | | |
| | D. | 0 – 2 – 4 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 1 – 3 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***